# ДРУГОЕ ЖЫЦЦЁ ГАРАДЗЕНСКАГА ЛЯМУСА

*Крыніца публікацыі:*
Майніч, Ладзік. Другое жыццё гарадзенскага лямуса [Электронны рэсурс] // racyja.com. – Рэжым доступу: https://www.racyja.com/vandrouki/drugoe-zhytstsyo-garadzenskaga-lyamusa/. – Дата доступу : 17.09.2019. – на бел. мове. – фота.

Далёка не ўсе гарадзенцы хоць раз бачылі ўнікальны помнік драўлянай архітэктуры – старажытны лямус 18-га стагоддзя. А рэч у тым, што ён размешчаны на тэрыторыі Брыгіцкага кляштара за высокімі мурамі. Сам гарадзенскі Брыгіцкі кляштар звонку не ўяўляецца такім вялікім і маштабным, які ён ёсць насамрэч.




РАЦЫЯ


РАЦЫЯ

Лямус у двары Гарадзенскага кляштара брыгітак пабудаваны паводле некаторых звестак яшчэ ў 1630-ыя гады, але, праўдападобна, у канцы 18 стагоддзя, у стылі ранняга барока. Гэты двухпавярховы драўляны будынак зроблены з вялікіх брусоў. Першы паверх пачаткова служыў гаспадарчым мэтам, другі паверх некалі быў жылым. У савецкі час на тэрыторыі кляштара месцілася медыцынская ўстанова. Зараз надыйшоў час паслужыць лямусу турыстычным мэтам. І сапраўды аналагічных будынкаў вельмі мала ў Еўропе, так што горад над Нёманам можа ганарыцца сваім архітэктурным здабыткам. Зараз у драўляным лямусе ідзе рамонт, замяняюцца балясіны і вокны, ужо адрамантаваны дах.












РАЦЫЯ


РАЦЫЯ


РАЦЫЯ